# СЛЯДЫ РОДУ РЭЙТАНАЎ У ПАРЫЖЫ

*Сцебурака А.*

Калі размова ідзе пра ўратаванне сядзібы Рэйтанаў у Грушаўцы, стварэнне там музея, захаванне памяці роду, дастаткова лагічна пашырыць кола даследавання і звярнуць увагу на наступнае пакаленне роду Рэйтанаў, што жыло ў XIX стагоддзі. Калі для часоў Тадэвуша Рэйтана асноўным выпрабаваннем былі Падзелы Рэчы Паспалітай і Паўстанне Т. Касцюшкі, то для яго пляменнікаў лёс так сама прадугледзеў свае іспыты: вайну 1812 г. і Паўстанне 1830-1831 гг.

На шчасце, ужо больш няма неабходнасці ў каторы раз пераказваць усім добравядомую гісторыю подзвігу Тадэвуша Рэйтана на "падзельным сойме" 1773 г. Так, для нас роля Т. Рэйтана ў гісторыі Краіны бясспэрчная. "Рэйтан = патрыёт" – гэта аксіёма. Таму перайду да заяўленай тэмы: "Пляменнікі і пляменніцы Тадэвуша Рэйтана: парыжскі след."

**Дамінік Рэйтан – ЛІЦВІН!**

Біяграфія пляменніка Тадэвуша Рэйтана – Дамініка, афіцэра пры Генштабе Напалеона, дастаткова добра вывучана (найперш, дзякуючы руплівай даследчыцкай працы кіраўніка арт-супокі імя Тадэвуша Рэйтана). У прыватнасці, мы ведаем асноўныя этапы яго ваеннай кар'еры ў напалеонаўскім войску. З 1806(7) па 1814 г. ён прайшоў вайсковымі шляхамі ў Польскіх частках Вялікай арміі і быў да апошняга прыхільнікам Банапарта. У 1813 г. Дамініка ўзнагародзілі крыжам Ганаровага легіёна… (іл.1)


Ministère de la Guerre.
Reyten
Extrait des Minutes de la Secrétairerie d'état.
Au Palais de Dresden, le 9 Juillet 1813.
Napoléon, Empereur des Français, Roi d'Italie, Protecteur de la Confédération du Rhin, Médiateur de la Confédération Suisse,
Art. 1er.
Art. 2.
Pour ampliation

іл.1.

Пад час працы ў Ваенным архіве Францыі мне пашчасціла адшукаць справу Дамініка, якая на жаль, захоўвае толькі тры дакументы. Але і з іх мы атрымліваем каштоўныя звесткі. Найперш, на самой справе пазначана, што Рэйтан ліцвін (але гэта маглі зрабіць і пазней архівісты). Таму больш важкім аргументам будзе аналагічная згадка ў дакументах аб узнагародзе. Тут Дамінік зноў называецца ліцвінам! (гл. ілюстрацыю). Па вопыце працы з іншымі фондамі нашых землякоў скажу, што далёка не ўсе выхадцы з ВКЛ падкрэслівалі сваё ліцвінскае паходжанне, і таму ў французскіх дакументах яны былі пераважна палякамі. Рэйтан, відаць, прынцыповы акцэнтаваў на

гэтым увагу! У нашым змаганні з Польшчай за нацыянальнага героя Тадэвуша Рэйтана з'явіўся яшчэ адзін моцны аргумент! Не толькі Тадэвуш стаяў за адвечныя правы і незалежнасць ВКЛ, але і яго пляменнік, што са зброяй змагаўся за аднаўленне дзяржаўнасці, вызнаваў сябе ліцвінам!



іл.2

Зараз, валодаючы дакумент аб узнагародзе Дамініка крыжам Ганаровага Легіёна, мы павінны ініцыяваць уключэнне яго асобы ў Французскую Базу ЛЕАНОР (la base de données Léonore (Légion d'honneur)), дзе, на жаль, яго памылкова няма. Калі ж паўстане музей Рэйтана, то можна будзе звярнуцца па копіі дакументаў і, магчыма, замовіць ордэн для экспазіцыі.

**Могілкі. Дзе беларускія магілы, там наша зямля!**

Монмартрскія могілкі ў Парыжы – гэта вядомы апошні прытулак нашай эміграцыі XIX стагоддзя. Там магілы і напалеонаўскіх камбатантаў, і паўстанцаў, і дзеячаў культуры. Узгадаем хаця б мастака Валенція Ваньковіча, чый прах там сёння спачывае…

Там стаіць крыж пляменніцы Тадэвуша Рэйтана – Ганне Герыч (народжанай Рэйтан) і яе сыну Эдварду. Ганна вядома нам як мемуарыстка (на прыклад, гісторык Вольга Гарбачова ў часопісе “Архэ” не так даўна надрукавала фрагмент гэтых успамінаў). Ганна стала прыкладам патрыёткі, якая добраахвотна паехала ў эміграцыю за сваім сынам. А Эдвард, паўстанец 1831 г., быў заўважным чальцом эміграцыйнага руху і сябраваў з Адамам Міцкевічам.

На жаль, на Монмартрскіх кладах існуе пагроза знішчэння тых помнікаў, што ў кепскім стане і пры гэтым не маюць страхоўкі ў выглядзе таблічкі “захоўваць вечна”. На жаль, такія магілы, паступова ліквідуюцца, сведкам чаму я стаў, шукаючы іншыя беларускія пахаванні.

Для ўзнаўлення повязі між падзеленымі часам і межамі членамі роду Рэйтанаў, я перадаў зямлю з Грушаўкай капліцы і Ляхавіцкага цвінтара на іх магілу ў Парыжы. І ў сваю чаргу, прывёз на Радзіму, жменьку зямлі з іх пахавання.

У бліжэйшай перспектыве, варта заняцца пытаннем рэстаўрацыі крыжа і застрахаваць ад знішчэння пахаванне. (гл. ілюстрацыю 2) Зрабіць гэта можна пры кааперацыі з музеям Адама Міцкевіча ў Парыжы, які займаецца апекай у тым ліку і гэтых могілак.

Між іншым, у Ваенным архіве Францыі сярод справаў інсургентаў-эмігрантаў удалося адшукаць паперы Ганны Герыч і яе сына Эдварда, якія пакуль, падаецца, не вядомыя даследчыкам і могуць даць новыя звесткі пра акалічнасці прыезду Ганны на дапамогу сыну ў эміграцыю. Лічыцца, што яна быццам бы з'явілася ў Парыжы, каб вярнуць выдаткаваныя ў час вайны 1812 г. грошы свайго мужа. Рэчаіснасць была іншай: маці імкнулася націснуць на французскую адміністрацыю, каб дабіцца дазволу пераехаць Эдварду з правінцыйнага горада ў сталіцу і натуралізавацца.


іл.3

Такім чынам, французскі кірунак у вывучэнні гісторыі роду Рэйтанаў у XIX стагоддзі далёка не вычарпаны, а апека над пахаваннем Ганны Герыч (Рэйтан) і яе сына можа стаць яшчэ адным добрым чынам арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана.